# СІМВАЛЫ СЯБРОЎСТВА

## Лёс беларускай дыяспары непарыўна звязаны з гісторыяй Саюзнай дзяржавы

**Савет Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Беларусы Расіі” правёў выязное пасяджэнне. Кіраўнікі і прадстаўнікі нацыянальна-культурных аўтаномій і арганізацый Омскай, Растоўскай, Томскай абласцей, Рэспублікі Крым, Башкартастана, Кабардзіна-Балкарыі і іншых рэгіёнаў наведалі землі Смаленшчыны і Віцебшчыны, а таксама Мінск. У рамках пасяджэння было арганізавана маштабнае мерапрыемства "Днепр – рака сяброўства”, прымеркаванае да 80-годдзя вызвалення Смаленшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прайшлі канцэрты і круглыя сталы, дэлегацыя наведала мясціны баявой славы, усклала кветкі ў памяць пра герояў. Таксама прадстаўнікі беларускай дыяспары выкарысталі гэты час, каб падзяліцца сваімі напрацоўкамі і намеціць далейшыя планы.**

Як заўважыў старшыня ФНКА “Беларусы Расіі”, член прэзідыума Савета пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па міжнацыянальных адносінах, член Кансультатыўнага савету па справах беларусаў замежжа пры МЗС Рэспублікі Беларусь Сяргей Кандыбовіч падчас сустрэчы ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску кіраўнікі актыву не толькі робяць карысныя справы ў месцах свайго пражывання, але і назіраюць за падзеямі, якія адбываюцца ў свеце, актыўна супрацоўнічаюць з беларускімі ўстановамі. Адзін з праектаў дыяспары ў Расіі – выдавецкі. Кнігі патрыятычнага зместу перадаюцца ў бібліятэкі, аб’яднанням беларусаў замежжа з іншых краін. У мінулым годзе дзейнасць беларусаў Расіі была адзначана на вышэйшым узроўні. Са сцэны ў Віцебску падчас фестывалю “Славянскі базар” прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва аўтарскаму калетыву, актывістам ФНКА ўручаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Выдавецкайдзейнасцю ФНКА











займаецца ўжо больш дзесяці гадоў і будзе працягваць такі кірунак працы. Кнігі з патрыятычнай тэматыкай выходзяць у розных рэгіёнах Расіі, дзе дзейнічаюць беларускія суполкі. Сярод актывістаў беларускай дыяспары шмат пісьменнікаў, гісторыкаў, яны займаюцца даследчыцкай дзейнасцю, збіраюць песні, успаміны перасяленцаў, звесткі пра вядомых суайчыннікаў.

Сяргей Кандыбовіч узгадаў пра выданне "Анталогія беларускай паэзіі". Федэрацыя будзе хадайнічаць аб тым, каб і кніга, і аўтарскі калектыў былі адзначаны прэміяй Расійскай Федэрацыі ў галіне культуры.

арганізацыя пастаянных лекторыяў у анлайн- і афлайн- фарматах. Установа ўзаемадзейнічае і арганізоўвае метадычнае забеспячэнне з усімі бібліятэкамі краіны, якія адносяцца да Міністэрства культуры, а таксама развівае стасункі з замежнымі калегамі.

Актыўна развіваюцца міжнародныя сувязі. Толькі за апошнія пару месяцаў у бібліятэцы прайшлі міжнародныя круглыя сталы, першы Беларуска-ўзбекскі жаночы форум, яе наведала дэлегацыя Рэспублікі Казахстан. Наладжана шчыльнае супрацоўніцтва

Беларускае бежанства ў гады Першай сусветнай вайны сыграла ключавую, важнейшую ролю ў прабуджэнні беларускай самасвядомасці. Можна ўзгадаць пра Беларускі абласны камітэт у Петраградзе, Беларускі нацыянальны камісарыят спачатку ў Петраградзе, пасля – у Маскве, беларускі з'езд бежанцаў, Беларускі народны ўніверсітэт, Народную бібліятэку. Магутныя беларускія цэнтры былі ў Стаўрапалі, Казані. У Петраградзе было створана першае легальнае беларускае выдавецкае аб'яднанне "Загляне сонца і ў наша



## Тэмы для даследаванняў

Дзякуючы праграме "Беларусы свету" ва ўсіх рэгіёнах, дзе дзейнічаюць аб'яднанні беларусаў Расіі, фарміруюцца бібліятэкі з беларускімі выданнямі. За гэта Сяргей Львовіч падзякаваў Міністэрству інфармацыі і Міністэрству культуры Беларусі, Упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, Нацыянальнай бібліятэцы.

З апошняй дыяспара даўно і шчыльна супрацоўнічае. Тэмы для далейшага ўзаемадзення і магчымасці развіцця культурных сувязяў паміж краінамі госці абмеркавалі з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Вадзімам Гігіным.

Вадзім Францавіч расказаў пра праграмы, якія рэалізоўвае ўстанова. Сёння яна з'яўляецца адным з буйнейшых культурных цэнтраў нашай краіны, у якім працуе вялікі калектыў прафесіяналаў. Безумоўна, сёння ўвага ўдзяляецца папулярызацыі папяровай кнігі, распрацоўваюцца праграмы, накіраваныя на падрастаючае пакаленне. Але бібліятэка перастала быць проста месцам захавання і выдачы кніг. Яна ставіць перад сабой задачы па папулярызацыі навуковых ведаў, прасоўванню нацыянальнай гістарычнай палітыкі. У планах –

з расійскім пасольствам, амаль кожны тыдзень бібліятэка прымае дэлегацыі з розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, падпісвае пагадненні аб супрацоўніцтве, яе фонды папаўняюцца новымі кнігамі.

Вадзім Гігін агучыў перад кіраўнікамі беларускіх суполак у Расіі тэмы, якія трэба ўздымаць на сумесных мерапрыемствах. На яго думку, яшчэ мала ўдзяляецца ўвагі гісторыі беларускай дыяспары. "Цяжка пераацаніць тую ролю, якую ў свой час адыгралі беларускія арганізацыі, што дзейнічалі па-за межамі Беларусі.



аконца", друкаваліся газета "Дзянніца" і часопіс "Чырвоны шлях". Можна ўзгадваць пра беларусаў у Сібіры, якія перааязджалі ў часы Сталыпінскай

рэформы, пра месцы, куды яны ехалі ў эвакуацыю ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра асваенне Сібіры і Дальняга Усходу ў пасляваенныя гады", – такія тэмы для абмеркавання і вывучэння прапанаваў Вадзім Гігін, які таксама з'яўляецца старшынёй рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства "Веды".

Кіраўнік лабараторыі гісторыі дыяспар і міграцый і вучэбна-навуковага кірунку "Беларусазнаўства і гісторыя беларускай дыяспары" гістарычнага факультэта МДУ Аксана Салопава заўважыла, што гісторыя беларускай дыяспары непарыўна звязана з гісторыяй Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы. Шмат у чым беларусы Расіі ўплывалі на сувязі, якія ўстанаўліваліся паміж абедзвюма дзяржавамі, на працэсы, якія адбываліся. Таму сёння неабходна развіваць супрацоўніцтва ў галіне даследчыцкай дзейнасці. Дарэчы, летам гэтага года прайшоў першы форум гісторыкаў Беларусі і Расіі, падчас ягога было прынята рашэнне аб стварэнні расійска-беларускага экспертнага савета па гісторыі.

## Агульныя імёны

У Расіі шмат знакавых мясцін, звязаных з лёсамі знакамітых беларусаў. Старшыня грамадскай арганізацыі беларусаў Казані "Спадчына" Сяргей Марудзенка нагадаў, што ў Татарстане створаны адзіны на тэрыторыі Расіі музей Янкі Купалы, які знаходзіцца ў будынку, дзе Купала і яго жонка жылі ў эвакуацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Беларусы Крыма даглядаюць магілу Максіма Багдановіча ў Ялце, праводзяць шматлікія мерапрыемствы, звязаныя з ушанаваннем памяці паэта. Старшыня рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Крыма" Раман Чэгрынец падзяліўся планамі аб стварэнні ў Крыму музея Максіма Багдановіча. Ужо нават знойдзена памяшканне пад яго. Але ёсць пэўныя складанасці ў стварэнні экспазіцыі. На жаль, у Крыме не захавалася асабістых рэчаў пісьменніка, таму беларуская суполка звярнулася з просьбай да супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі дапамагчы з распрацоўкай канцэпцыі музея і прадметамі для экспазіцыі. Вадзім Гігін запэўніў, што сапраўды ў Беларусі можна падабраць цікавыя матэрыялы для такога музея, ёсць факсімільныя выданні, архівы, матэрыялы, звязаныя з бацькам Максіма Багдановіча. Сваю просьбу Раман Чэгрынец агучыў і міністру культуры Беларусі Анатолю Маркевічу падчас дыялогавай пляцоўкі, якая прайшла ў рамках Фестывалю мастацтваў беларусаў свету, і на сустрэчы ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі .

Старшыня савета Кабардына-Балкарскага грамадскага руху "За яднанне "Сябры" Павел Сідарук расказаў, што на Паўночным Каўказе, дзе ён жыве, дзейнічае Цэнтр беларускай культуры, у рамках вучэбнай праграмы беларусы вывучаюць родную мову, захоўваюць традыцыі і нацыянальную кухню. Назва аднаго з хутароў – Мінскі – застаецца сведчаннем, перасяленцы з якіх краёў тут пасяліліся яшчэ стагоддзе таму.



У мінулым годзе ў горадзе Сцерлітамак Рэспублікі Башкірыя была зарэгістравана мясцовая нацыянальна-культурная аўтаномія "Спадчына". Кіраўнік арганізацыі Вікторыя Шарупа падчас сустрэчы перадала ў Нацыянальную бібліятэку сваю кнігу і расказала, што ў яе родзе многа пісьменнікаў, а дзядзька, Аляксандр Матусевіч, працаваў журналістам у газеце "Звязда". Ён пісаў пра асушэнні балот, і адным з першых расказаў пра калгас "Чырвоная змена", які быў вядомы далёка за межамі Беларусі, і старшыня якога Кузьма Шаплыка атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Сяргей Кандыбовіч запэўніў, што беларуская дыяспара заўсёды гатова далучацца да праектаў, якія рэалізуюцца на гістарычнай радзіме. Ён нагадаў, што беларусы Расіі дапамаглі выкупіць на аўкцыёне асобнік Статута ВКЛ, які сёння захоўваецца ў Музеі гісторыі Магілёва. У музей Янкі Купалы імі былі перададзены таксама набытыя на аўкцыёне невядомыя партрэты Песняра.

Ганна **Трошына**

Фота Алены Дзядзюлі